понижаться 1. паніжàцца, зніжàцца; 2 (*о цене*)—змяншàцца, зніжàцца.
понижение 1. паніжэ̀нне, зніжэ̀нне; 2. (*цены*)—змяншэ̀нне, зніжэ̀нне.
понизать—панізàць.
понизить 1. панізіць, знізіць; 2. (*цену*)—змèншыць, знізіць.
понизиться 1. панізіцца, знізіцца; 2. (*о цене*)—змèншыцца, знізіцца.
поникнуть—панікнуць, схілíцца.
поникший—панíклы, пахíлы.
понимание—разумènне.
понимать—разумèць.
поножовщина—панажòўшчына.
понос—панòс.
поносить I—панасíць.
поносить II—гàніць, гàньбіць, зневажàць, зняслаўля̀ць.
поношение—ганьбаванне, зневажэ̀нне, зняслàўленне.
понравиться—спадабàцца.
понтон *воен.*—пантòн.
понтонный—пантòнны.
понудительный—прымусòвы.
понудить—прымýсіць.
понуждать—прымушàць.
понукание—панукàнне.
понукать—панукàць.
понурить *(голову)*—панýрыць, звèсіць.
понурый—панýры, хмýры.
поныне—дагэ̀туль, да гэ̀тага чà̀су.
понюхать—панюхаць.
понятие—паня̀цце.
понятливость—панятлівасць.
понятливый—панятлівы.
понятно—зразумèла.
понятность—зразумèласць.
понятный—зразумèлы.
понятой *уст.*—паняты.
понятый—зразумèты.
понять—зразумèць.
пообедать—паабэ̀даць.
поодаль—вòддаль, здалёку.
поострить—паастрыць.
поочерёдно—па чарзè.
поощрение—заахвòчванне.
поощрять—заахвòчваць.
поп—поп.
попадание (*в цель*)—пападàнне.
попадать—папàдаць, пакідацца.
попадать—пападàць, трапля̀ць.
попарить—папàрыць.
попариться—папàрыцца.
попарно—пàрамі, папàрна.
по-партийному—па-партыйнаму.
попасть—папàсці, трàпіць.
попасться—папàсціся, трàпіцца.
поперёк—упòперак.
попеременно—паперамèнна, пазмèнна.

поперечина—папярэ́чына.
поперечник—папярэ́чнік.
поперечный—папярэ́чны.
поперхнуться→папярхну́цца.
попечение—апе́ка, апекава́нне.
попечитель—апяку́н.
попечительство—апе́ка, апекава́нне, апяку́нства.
попивать—папіва́ць.
попилить—папілава́ць.
попирание—папіра́нне, тапта́нне.
попирать—папіра́ць, тапта́ць.
списывать—папі́сваць.
поплавать—паплава́ць.
поплавок—паплаво́к.
поплакать—паплака́ць.
поплатиться—паплаці́цца.
по-плечу—пад сі́лу, па сі́ле.
поплыть—паплы́ць.
поплясать—паскака́ць, патанцава́ць.
поповник *бот.*—пастэрна́к, рамо́н, рамо́нак.
попоить—папаі́ць.
попойка—папо́йка.
пополам—папала́м.
пополэновение—замэ́р, замах.
пополнение—папаўне́нне.
пополнеть—папаўне́ць.
пополнить—папо́ўні́ць.
пополниться—папо́ўні́цца.
пополнять—папаўня́ць.
пополняться—папаўня́цца.
пополудни—папо́ўдні, пасля́ по́ўдня.
пополоскать—папаласка́ць.
пополоть—папало́ць.
пополуночи—папо́ўначы, апо́ўначы.
попользоваться—пакарыста́цца.
попомнить—папо́мні́ць.
попона—папо́на.
попороть—папаро́ць.
попорошить—папарашы́ць, пацерусі́ць.
попортить—папсава́ць.
попотчевать—пачастава́ць.
поправить—папра́ві́ць, нала́дзіць.
поправиться 1. папра́ві́цца; 2. (*выздороветь*)—папра́ві́цца, паздаравець, ачуня́ць.
поправка—папра́ўка.
поправлять—папраўля́ць, нала́джваць.
поправляться—папраўля́цца, ачу́ньваць.
попрать—папра́ць, патапта́ць.
по-прежнему—паранейшаму, падаўне́йшаму.
по преимуществу—перава́жна.
попрёк—папро́к, дако́р, упіка́нне.
попрекать—папрака́ць, упіка́ць, дакара́ць.
попрекнуть—папракну́ць, упікну́ць.
поприще—аре́на; на литературном поприще—на літаратурным полі дзейнасці.
попробовать—папрабава́ць, паспрабава́ць.
попросить—папрасі́ць.
попросту—папро́сту, папро́стаму.
попрошайничать—жабрава́ць.
попрощаться—развіта́цца.
попрыгать—паскака́ць.
попрыгунья—скаку́ха.
попрятать—пахава́ць.
попрятаться—пахава́цца.
попугай *зоол.*—папуга́й.
попугать—папужа́ць, папало́хаць, папу́дзіць, пастра́шыць.
популяризатор—папулярызатар.
популяризация—папулярыза́цыя.

популяризировать—папуля-рызава̀ць.
популярность—папуля̀рнасць.
популярный—папуля̀рны.
полури *муз.*—папуры́.
попустительство—патура̀нне.
попустительствовать—патура̀ць.
попусту—ма̀рна, дарма̀, дарэ̀мна.
попутаць—паблы́таць.
попутничество—спадаро̀жніцтва.
попутно—па даро̀зе, мімахо̀дам.
попутный—спадаро̀жны.
попутчик—спадаро̀жнік.
попущение—папушчэ̀нне, патура̀нне.
попытаться—паспрабава̀ць, папрабава̀ць.
попытка—спро̀ба.
попятиться—адступі̀цца, пада̀цца наза̀д.
попятный: пойти на попятный—адмові̀цца, адрачыся ад слова, адступі̀цца.
пора—пара̀; до каких пор—да якога часу; до сих пор—да гэтага часу; впору—у пару; порой—парою; с тех пор—з таго часу.
пора *биол.*—по̀ра, сі́тавіна.
поработитель—прыгнята̀льнік.
поработить—прыгнёсці, занявало̀ніць.
порабощать—прыгнята̀ць, занявало̀льваць.
порабощение—прыгнёт, занявало̀льванне.
поравнять—параўня̀ць.
порадеть *уст.*—удружы́ць (каму), парўпі̀цца, паклапаці̀цца (аб кім).
порадовать—пара̀даваць.
поражать 1. *(наносить удар)*—паража̀ць; 2. *(производить сильное впечатление)*—здзіўля̀ць.
поражаться—здзіўля̀цца.
пораженец—паражэ̀нец.
поражение—паражэ̀нне.
пораженческий—паражэ̀нчы.
пораженчество—паражэ̀нцтва.
поразительный—здзіўля̀ючы.
поразить 1. *(нанести удар)*—паразі̀ць; 2. *(произвести сильное впечатление)*—здзіві̀ць.
поранение—паранэ̀нне.
поранить—пара̀ніць.
пораньше—ранэ̀й, за̀гадзя.
порасти—парасці́.
порвать—парва̀ць, падра̀ць.
порваться—парва̀цца, падзэ̀рціся.
поредевший—парадзэ̀лы.
поредеть—парадзэ̀ць.
порез—парэ̀з.
порезать—парэ̀заць.
поречный—парэ̀чны, узрэ̀чны, паўзрэ̀чны.
поречье—парэ̀чча, узрэ̀чча, паўзрэ̀чча.
порешить 1. *разг. (решить)*—рашы́ць, нава̀жыцца; 2. *(убить)*—забі́ць.
пористость—по̀рыстасць, сі́тавіннасць.
пористый—по̀рысты, сі́тавінны.
порицание—ганьбава̀нне.
порицатель—ганьбі́цель.
порицать—га̀ніць, га̀ньбіць, ганьбава̀ць.
порнографический—парнаграфі́чны.
порнография—парнагра̀фія.
поровну—паро̀ўну, ро̀ўна.
поровняться—параўня̀ц-ца.
порог—паро̀г.
порода—паро̀да.
породистость—паро̀дзістасць.

породниться—зрадні̀цца, парадні̀цца.
порождать—параджа̀ць, спараджа̀ць.
порождение—параджэ̀нне.
порожистый—парò̀жысты.
порожний—парò̀жні, пусты́.
порожняк *ж.-д.*—паражня̀к.
порожняком—паражняко̀м, улѐгцы.
порознь—паасо̀бку, паасо̀бна.
порой—парò̀ю, парò̀й.
порок—парò̀к, зага̀на.
поросёнок—парася́, парасё.
пороситься—парасі̀цца.
поросль—па̀растак.
поростать—парастà̀ць, зарастà̀ць.
порости—парасці̀, зарасці̀.
поросший—парò̀сшы.
поросятина—парася̀ціна.
пороть 1. (*распарывать*)—парò̀ць; 2. (*бить*)—бі̀ць, сцябà̀ць, хвастà̀ць.
порох—по̀рах.
пороховой—парахавы́.
порочить—га̀ньбіць, га̀ніць.
порочный—парò̀чны, зага̀нны.
пороша—парò̀ша.
порошинка—парушы́нка.
порошить—церусі̀ць, церушы́ць.
порошок—парашò̀к.
порт—порт.
портал *арх.*—парта̀л.
портативность—партаты́ўнасць.
портативный—партаты́ўны.
портвейн—партвѐйн.
портик *арх.*—по̀рцік.
портить—псава̀ць.
портиться—псава̀цца.
портландский цемент *тех.*—партла̀ндскі цэмѐнт.
портниха—шва̀чка, краўчы́ха.
портной—кравѐц.
портняжить—краўцава̀ць, шыць.
портняжный—кравѐцкі.
портовой—партавы́.
порто франко *эк.*—по̀рта-фра̀нко.
портрэт—партрэ̀т.
портретный—партрэ̀тны.
портсигар—партсіга̀р, партаба̀к.
португальский—партуга̀льскі.
портулак *бот.*—партула̀к.
портупея—партупѐя.
портфель—партфѐль.
портьера—парт'ѐра.
портянка—анўча, парця̀нка.
порубить—пасячы́, парубі̀ць.
порубка—парў̀бка.
порубщик—парў̀бшчык.
поругаться—пала́яцца, пасвары́цца.
порука—парў̀ка.
поручать—даруча̀ць.
поручение—дарў̀чэнне.
поручитель—паручы́цель.
поручительница—паручы́цельніца, паручы́целька.
поручительство—паручы́цельства.
поручить—даручы́ць.
поручиться—паручы́цца.
порфир *мин.*—парфі̀р.
порфира—парфі̀ра.
порхание—пы́рханне.
порхать—пы́рхаць.
порхнуть—пы́рхнуць.
порцион—парцыён.
порционно—парцыённа.
порционный—парцыённы.
порция—по̀рцыя.
порча—псава̀нне.
поршень—по̀ршэнь.
поршневой—по̀ршневы.
порыв—парыў.
порываться—парыва̀цца, імкнў̀цца.
порывистость—парыўнасць, імкліва́сць.
порывистый—парыўны, імкліва́ы.

порыжелый—парыжэ́лы.
порыжеть—парыжэ́ць.
порыться—пакапа̀цца, парыцца.
порядковый—пара̀дкавы, чаргòвы.
порядок—пара̀дак, лад.
порядочно—дòсыць мнòга, давòлі, шмат.
порядочный 1. не малы; 2. *(о человеке)*—прыстòйны.
посад—паса̀д.
посадить—пасадзі́ць.
посадка—паса̀дка.
посвежеть—пасвяжэ́ць.
посветить—пасвяці́ць.
посвистать—пасві́ста̀ць.
посвятить—прысвяці́ць.
посвящать 1. прысвячаць; 2. *(во что-либо)*—увòдзіць у курс спра̀вы.
посвящённый 1. прысвèчаны; 2. увèдзены ў курс спра̀вы.
посев—сяўба̀.
посевной—пасѐўны; посевная площадь—пасѐўная плошча.
поседевший—пасівэ́лы.
поседеть—пасівэ́ць.
поселенец—пасялѐнец.
поселение—пасэ́лішча, пасялѐнне.
поселить—пасяліць.
поселиться—пасяліцца.
посёлок—пасёлак.
посёлковый—пасёлкавы.
поселять—сяліць, пасяля́ць.
поселяться—сяліцца, пасяля́цца.
посеребрение—пасярэ́бранне, пасерабрэ́нне.
посеребрить—пасярэ́брыць, пасерабры́ць.
посередине—пасярэ́дзіне, пасярòд.
посетитель—навèдвальнік.
посетительница—навèдвальніца.
посетить—навèдаць.
посещаемость—навèдванне.
посещать—навèдваць.
посещение—навèдванне.
посеять—пасэ́яць.
посидеть—пасядзэ́ць.
посильный—пасі́льны.
посинелый—пасінэ́лы.
посинеть—пасінэ́ць.
посинить—пасініць.
поскакать—паскака̀ць.
поскользнуться—паслізну̀цца, пакаўзну̀цца.
поскольку—паскòлькі.
посконный—паскòнны.
поскорее—хутчэ́й.
поскрёбки—паскрòбкі, вы́скрабкі.
поскупиться—паскупіцца.
послабление—паслабле́нне.
послание—паслà нне.
посланник—паслà ннік.
посланный—паслà ны.
послать—паслà ць.
после—пасля́, пòтым.
послевоенный—пасляваѐнны.
послед *анат.*—паслѐд.
последний—апòшні, астà тні.
последование—паслѐдванне.
последователь—паслядòўнік.
последовательница—паслядòўніца.
последовательность—паслядòўнасць.
последовательный—паслядòўны.
последовать 1. *(за кем)*—пайсці́ слѐдам; 2. *(примеру)*—паслѐдаваць.
последствие—вы́нік.
последующий—насту́пны.
послезавтра—пазаўтра, паслязаўтра.
послезавтрашний—паслязаўтрашні.

послеобеденный—паабѐдзенны, пасляабѐдзенны.
послеоктябрьский—пасля кастры́чніцкі.
послесловие—пасляслòўе.
пословица—прыка́зка.
послужить—паслужы́ць.
послужной: послужной список—службовы спіс.
послушание—паслу́хмянасць.
послушать—паслу́хаць.
послушаться—паслу́хацца.
послушный—паслухмяны.
послышать—пачу́ць.
послышаться—пачу́цца.
посматривать—паглядва̀ць, пазіра̀ць.
посмеиваться—пасмея́вацца.
посменно—пазме́нна.
посмертный—пасмяро̀тны.
посметь—адва̀жыцца, асме́ліцца, пасме́ць.
посмешище—пасме́шышча.
посмеяние—по̀смех.
посмеяться—пасмя́яцца.
посмотреть—паглядзѐць.
поснимать—пазніма̀ць.
пособие—дапамо̀га.
пособить *разг.*—дапамагчы, пасо̀біць.
посоветовать—пара̀іць, парадзіць.
посодействовать—пасадзе́йнічаць.
посол—пасо̀л.
посолить—пасалі́ць.
посольский—пасо̀льскі.
посольство—пасо̀льства.
пососать—пасса̀ць, пасмакта̀ць.
посох—кій, по̀сах.
посохнуть—пасо̀хнуць.
посочувствовать—паспагада̀ць, паспачува̀ць.
поспать—паспа̀ць.
поспевать I (*созревать*)—паспява̀ць.
поспевать II (*быть к сроку*)—паспява̀ць, упраўля́цца.
поспешить—паспяшы́ць.
поспешно—паспе́шна, спе́хам, спяша́ючыся.
поспешность—паспе́шнасць.
поспешный—паспе́шны.
поспорить—паспрача́цца.
посрамить 1. *(постыдить)*—пасаро̀міць. 2. *(опозорить)*—зга̀ньбіць, зняслàвіць.
посрамиться—зга̀ньбіцца, зняслàвіцца.
посреди—сяро̀д, пасяро̀д, паміж.
посредине—пясярэ̀дзіне.
посредник—пасрэ̀днік.
посредница—пасрэ̀дніца.
посредничать—пасрэ̀днічаць.
посреднический—пасрэ̀дніцкі.
посредничество—пасрэ̀дніцтва.
посредственность—пасрэ̀днасць, звыча́йнасць.
посредственный—пасрэ̀дны, звыча́йны.
посредство: посредством чего—з дапамогай (чаго), праз (што).
поссориться—пасварыцца.
пост—пост.
постав (*мельничный*)—паста̀ў.
поставить—паста̀віць; поставить в известность—паведаміць, давесці да ведама.
поставка—паста̀ўка.
поставлять—паста́ўляць.
поставщик—паста́ўшчык.
постамент—пастамэ́нт.
постановить—пастанавіць.
постановка—пастано̀ўка.
постановление—пастано̀ва.
постараться—пастара̀цца.
постареть—пастарэ̀ць.
по-старому—па-ста̀раму.
постель—пасцэ̀ль.
постельный—пасцэ̀льны.

постепенно—паступо̀ва.
постепенность—паступо̀васць.
постепенный—паступо̀вы.
постеречь—пасцерагчы̀, папі̀льнава̀ць.
постигать—пасці̀га̀ць, разумѐць.
постигнуть—пасці̀гнуць, зразумѐць.
постижение—пасці̀жэ̀нне, зразумѐнне.
постижимый—дася̀жны, даступ̆ны.
постичь—пасці̀гнуць, зразумѐць.
постилать—сла̀ць, засці̀ла̀ць.
постилка *(в стойле)*—по̀дсці̀л.
постирать 1. *(белье)*—пасці̀ра̀ць, памы̀ць; 2. (*пыль*)—пасці̀ра̀ць.
поститься—пасці̀ць, пасці̀цца.
постлать—пасла̀ць.
постлаться—пасла̀цца.
постный—по̀сны; постное ма̀сло—алей.
постовой—паставы̀.
постольку—пасто̀лькі.
посторониться—пастарані̀цца, сыйсці̀ ў бок.
посторонний—пабо̀чны.
постоялец—пастая̀лец.
постоянно—пастая̀нна, ста̀ла, заўсѐды.
постоянный 1. пастая̀нны, ста̀лы; постоянный ток *физ.*—пастаянны ток; постоянный житель—сталы жыхар.
постоянство—пастая̀нства, ста̀ласць.
постоять—пастая̀ць.
пострадать—папакў̀таваць, памў̀чыцца.
постраничный—ад старо̀нкі.
пострелёнок—жэ̀ў̀жык.
постричь—пастры̀гчы.
постричься—пастры̀гчыся.
построение 1. пабудо̀ва; 2. (*в ряды*)—пастраѐнне.
построить—пабудава̀ць.
постройка—будо̀ў̀ля, буды̀нак.
постромка—пастро̀нак.
построчный—адрадко̀вы.
постукивание—пастў̀кванне.
постукивать—пастў̀кваць.
постулат *филос.*—пастула̀т.
поступательный—паступа̀льны.
поступать 1. (*куда*)—паступа̀ць; 2. *(обходиться с кем-либо)*—абыхо̀дзіцца.
поступить—паступі̀ць.
поступиться—паступі̀цца.
поступление—паступлѐнне.
поступок—учы̀нак.
поступь—по̀ступ, хада̀.
постучать—пастў̀каць.
постыдить—пасаро̀міць.
постыдиться—пасаро̀міцца.
постыдный—ганѐбны.
постылый—абры̀длы, пасты̀лы.
посуда—пасў̀да.
посудный: посудный магазин—пасў̀дны магазѝн.
посулить—пасулі̀ць, паабяца̀ць.
посчастливиться—пашчасл̀і̀віцца, пашанцава̀ць.
посчитать—палічы̀ць.
посчитаться *(с кем-либо)*—палічы̀цца, паквіта̀цца.
посылать—пасыла̀ць.
посылка—пасы̀лка.
посыльный—пасы̀льны.
посыпать—пасы̀паць.
посыпать—пасыпа̀ць.
посыпаться—пасы̀пацца.
посягательство—замах, замѐр.
посягать—пасяга̀ць, рабі̀ць замах.
пот—пот.
потаённый—патаѐмны.
потайной—пата̀йны.
потакание—патура̀нне.

потакать—патура̀ць.
потанцовать—патанцава̀ць, паскака̀ць.
потасовка—лупцо̀ўка, бо̀йка.
поташ—пата̀ш.
потащить—пацягну̀ць, павалачы̀.
потворство—патура̀нне.
потворствовать—патура̀ць.
потёмки—пацёмкі.
потемнение—пацямнѐнне.
потемнеть—пацямнѐць.
потение—пацѐнне.
потенциал—патэнцыя̀л.
потенциальный—патэнцыя̀льны.
потенция—патэ̀нцыя.
потеплеть—пацяплѐць.
потереть—пацѐрці.
потерпеть 1. *(убыток, поражение)*—пацярпѐць, панѐсці; 2. *(подождать)*—пачака̀ць, пацярпѐць.
потеря—стра̀та.
потерять—згубі̀ць, стра̀ціць.
потесниться—пацясні̀цца.
потеть—пацѐць.
потеха—пацѐха.
потешать—пацяша̀ць.
потешаться—пацяша̀цца.
потешить—пацѐшыць.
потешиться—пацѐшыцца.
потешный—пацѐшны.
потерять—згубі̀ць, стра̀ціць.
потихоньку—паці̀хеньку, ці̀шко̀м.
потливость—патлі̀васць.
потливый—патлі̀вы.
потный—по̀тны.
потогонный—патаго̀нны.
поток—пато̀к, струмѐнь.
потолок—столь (жан. р.).
потолстеть—патаўсцѐць, пагладчэ̀ць.
потом—по̀тым, пасля̀.
потомок—пато̀мак.
потомственный—пато̀мсцвенны.
потомство—пато̀мства.
потому—таму; **потому что**—таму што, бо.
потонуть—патану̀ць, затану̀ць.
потоп—пато̀п.
потопить—затапі̀ць.
потопление—затаплѐнне.
поточный—пато̀чны.
потрава—патра̀ва.
потратить—стра̀ціць, патра̀ціць.
потребитель—спажывѐц.
потребительница—спажыва̀льніца.
потребительный—спажыва̀льны.
потребительский—спажывѐцкі.
потребление—спажыва̀нне.
потреблять—спажыва̀ць.
потребность—патрэ̀ба.
потребный—патрэ̀бны.
потребовать—патрабава̀ць, запатрабава̀ць.
потребоваться—патрабава̀цца.
потревожить—патрывро̀жыць, патурбава̀ць.
потревожиться—патрыво̀жыцца, патурбава̀цца.
потрепать—патрапа̀ць.
потрескивание—патрэ̀скванне.
потрескивать—патрэ̀скваць.
потроха—патрахі̀.
потрошить—патрашы̀ць.
потрудиться—папрацава̀ць.
потрясать—патраса̀ць, узру̀шваць.
потрясение—патрасѐнне, узрушэ̀нне.
потуги—патўгі, намага̀нні.
потупить *(глаза)*—спусці̀ць во̀чы.
потускневший—патускнѐлы, пацямнѐўшы, збля̀клы.

потускнеть—патускнѐць, пацямнѐць, збля̀кнуць.
потусторонний—патустаро̀нні.
потухать—патуха̀ць, згаса̀ць.
потухнуть—патӯхнуць, загà снуць, згà снуць.
потушить—патушы̀ць, пагасі̀ць.
потчевать—частава̀ць.
потягивание—паця̀гванне.
потягиваться—паця̀гвацца.
потянуть—пацягнӯць.
потянуться—пацягнӯцца.
поужинать—павячэ̀раць.
по-ударному—па-ӯда̀рнаму.
поумнеть—паразумнѐць.
поурочный—паурò чны; поурочная плата—паурочная плата.
поутру—зра̀нку, ра̀ніцаю, раніцо̀й.
поучать—навуча̀ць.
поучение—навуча̀нне.
поучительный—навуча̀льны.
похабный—паха̀бны.
похвала—пахвала̀, хвала̀.
похвалить—пахвалі̀ць.
похвальба—пахвальба̀, хвальба̀, выхва̀льства.
похвальный—пахва̀льны.
похвастаться—пахвалі̀цца.
похититель—злò дзей, крадзѐжнік.
похитить—укра̀сці.
похищать—кра̀сці.
похлёбка 1. пахлёбка, пò ліўка; 2. *(мучная)*—заці̀рка.
похлопать 1. паля̀скаць; 2. *(в ладоши)* — папля̀скаць; 3. (*крыльями*)—палò паць.
походить 1. пахадзі̀ць; 2. (*быть похожим*)—быць подò бным (да каго).
походка—паходка, хада̀.
походный—паходны.
похождение—прыгò да, авантӯра.
похожий—падò бны.
похоронить—пахава̀ць.
похоронный—пахава̀льны.
похороны—пахава̀нне.
похотли ость—пахатлі̀васць.
похотливый—пахатлі̀вы.
похоть—пò хаць.
похрапывать—храпці, пахра̀пваць.
похудеть—пахудзѐць.
поцеловать—пацалава̀ць.
поцелуй—пацалӯнак.
почаще—часцѐй.
почва—глѐба.
почвенный—глѐбавы.
почвоведение—глебазна̀ўства.
почему—чамӯ, чагò.
почерк—пò чырк.
почернеть—пачарнѐць.
почернить—пачарні̀ць.
почерпнуть—пачарпнӯць.
почесать—пачаса̀ць.
почесть—паша̀на.
почёт—паша̀на, гò нар.
почётный—ганарò вы, пачэ̀сны.
почечный—пò чачны
почивать *уст.*—спачыва̀ць.
почин—пачы̀н.
починить—папра̀віць.
починка—папра̀ўка.
починять—папраўля̀ць.
почитание—паважа̀нне, шанава̀нне.
почитать I—паважа̀ць, шанава̀ць.
почитать II—пачыта̀ць.
почка 1. *бот.*—пò чка; 2. *анат.*—пò чка.
почкование—*бот.*—пачкава̀нне.
почта—пò шта.
почтальон—паштальён.
почтамт—паштамт.
почтение—пава̀га, паша̀на, шанава̀нне.
почтенный—паважа̀ны, шанò ўны.

почти—амàль, бадàй; почти что—амаль што, бадай што.
почтительность—пачцівасць.
почтительный—пачцівы.
почтить—ушанавàць.
почтово-телеграфный—паштòва-тэлеграфны.
почтовый—паштòвы.
почувствовать—адчýць.
почудиться—здàцца.
пошатнуться—пахіснýцца.
пошехонец *перен.*—пашахòнец.
пошехонье *перен.*—пашахòне.
пошиб—манèра, стыль.
пошивочный: пошивочная мастерская—пашывачная майстэрня.
пошить—пашыць.
пошлина—пòшліна.
пошлинный—пòшлінны.
пошлость—пòшласць.
пошлый—пòшлы.
поштучный—паштýчны.
пощада—літасць.
пощадить—злітавàцца (над кім), памілаваць (каго).
пощёчина—аплявýха, пòýха.
пощупать—памàцаць.
поэзия—паэзія.
поэма—паэма.
поэт—паэт.
поэтесса—паэтэса.
поэтизировать—паэтызавàць.
поэтика—паэтыка.
поэтический, поэтичный—паэтычны.
поэтому—тамý, з прычыны таго.
появиться—з'явіцца.
появление—з'яўлènне.
появляться—з'яўляцца.
поярковый—паяркавы.
пояс—пòяс.
пояснение—тлумачэ̀нне.
пояснительный—тлумачàльны.
пояснить—растлумàчыць.
поясница—паяснíца.
поясничный—паяснíчны.
пояснять—тлумàчыць.
прабабушка—прабàбушка.
правда—прàўда.
правдивость—праўдзівасць.
правдивый—праўдзівы.
правдист *пол.*—праўдзíст.
правдолюбивый—праўдалюбівы.
правдоподобие—праўдападòбнасць.
правдоподобно—праўдападòбна.
правдоподобный—праўдападòбны.
правило—прàвіла.
правильно—прàвільна.
правильность—прàвільнасць.
правильный—прàвільны.
правитель—правíцель.
правительница—правíцелька.
правительственный—урàдавы.
правительство—урàд.
править I *(управлять)*—кіраваць.
править II (*исправлять*)—прàвіць.
правка—прàўка.
правление—праўлènне; член правления—член праўлення.
правнук—прàўнук.
правнучка—прàўнучка.
право—прàва.
правобережный—правабярэжны.
правовед—прававèд, правазнàвец, правазнàўца.
правоведение—правазнàўства.
правоверность—прававèрнасць.
правоверный—прававèрны.
правовой—прававы.

правозаступник—праваабаро̀нец, праваабаро̀нца, праваза́ступнік.
праволевацкий *пол.*—праваля̀вацкі.
правомерность—правамѐрнасць.
правомерный—правамѐрны.
правомочие—правамо̀цтва.
правомочный—правамо̀цны.
правонарушение—праванарушэ̀нне.
правонарушитель—праванарушальнік.
правооппортунистический—праваапартуні́сты́чны.
правописание—пра̀вапіс.
правопорядок—правапара̀дак.
православие *уст.*—праваслáўе.
православный—праваслáўны.
правоспособность—праваздо̀льнасць.
правоспособный—праваздо̀льны.
правосудие—правасу́ддзе.
правота—правата́.
правоуклонист—праваўхіліст.
правый—пра̀вы.
Прага—Пра̀га.
прагматизм—прагматы́зм.
прагматический—прагматы́чны.
прадед—пра̀дзед.
празднество—свя̀та.
праздник—свя̀та.
праздничность—свято̀чнасць.
праздничный—свято̀чны.
празднование—святкава̀нне.
праздновать—святкава̀ць.
празднословие—марнасло̀ўе.
праздность—бяздзе́йнасць, бяздзе́лле.
праздный—гуля̀шчы, бяздзе́йны.
практик—пра̀ктык.
практика—пра̀ктыка.
практикант—практыка̀нт.
практикантка—практыка̀нтка.
практиковать—практыкава̀ць.
практиковаться—практыкава̀цца.
практицизм—практыцы́зм.
практический—практы́чны.
практично—практы́чна.
практичность—практы́чнасць.
практичный—практы́чны.
прах—прах.
прачешная—пра̀льня.
прачка—пра̀чка.
праща—пра̀шча.
пращур—пра̀шчур.
праязык—першамо̀ва.
пребывание—прабыва̀нне, пражыва̀нне.
пребывать—прабыва̀ць, пражыва̀ць.
превалировать—прэвалі́раваць.
превзойти—перавы́сіць, узя̀ць верх.
превозмочь—перамагчы́.
превозносить—выслаўля̀ць.
превосходить—перавыша̀ць, пераважа̀ць, браць верх.
превосходно—вѐльмі до̀бра, надзвы́чай до̀бра.
превосходный—надзвы́чай до̀бры, вѐльмі до̀бры; превосходная степень *грам.*—найвышэ́йшая ступень.
превосходство—перава̀га.
превратить—ператвары́ць.
превратно—наадваро̀т, змѐнна.
превратность—змѐннасць, змѐнлівасць.
превратный 1. змѐнны, змѐнлівы; 2. (*извращённый*)—скажо̀ны, адваро̀тны, перакру́чаны.
превращать—ператвара̀ць.
превращение—ператварэ̀нне.
превысить—перавы́сіць.
превышать—перавыша̀ць.
превышение—перавышэ̀нне.
прегра́да—перашко̀да.

преградить *(дорогу)*—загарадзіць.
предавать—здраджваць.
предание 1. *(суду)*—аддáнне; 2. *(легенда)*—падáнне.
преданность—аддáнасць.
преданный—аддáны.
предатель—здрáднік.
предательница—здрáдніца.
предательский—здрáдніцкі.
предательство—здрáда, здрáдніцтва.
предать—здрáдзіць.
предварительно—папярэ́дне, перш, упе́рад.
предварительный—папярэ́дні.
предвестник—прадве́снік, вясшчу́н.
предвещать—прадвяшчáць.
предвзятость—прадузя́тасць.
предвзятый—прадузя́ты.
предвидение—прадбáчанне.
предвидеть—прадбáчыць.
предвкушать—смакавáць напе́рад.
предвкушение—смакавáнне напе́рад.
предводитель—правады́р.
предводительство—правады́рства.
предводительствовать—правадырствáваць.
предвозвещать—прадвяшчáць.
предвосхитить—упярэ́дзіць.
предвосхищать—упярэ́джваць.
предвыборный—перадвы́барчы; предвыборная кампания—перадвыбарчая кампанія.
предгорье—прыго́р'е, перадго́р'е.
преддверие—прыдзве́р'е, пераддзве́р'е.
предел—рубе́ж, граніца, мяжá.
предельный—грані́чны.
предзнаменование—прадзнаменавáнне.
предикат *грам.*—прэдыкáт.
предикация—прэдыкáцыя.
предисловие—прадмо́ва.
предлагать—прапано́ўваць.
предлог 1. *(причина)*—по́вад, прычы́на; 2. *грам.*—прыназо́ўнік.
предложение 1. прапано́ва; 2. *грам*—сказ.
предложить—прапанавáць.
предложный: предложный падеж *грам.*—месны склон.
предместье—прадме́сце.
предмет—прадме́т.
предметность—прадме́тнасць.
предметный—прадме́тны.
предназначать—прызначáць.
предназначение—прызначэ́нне.
предназначить—прызнáчыць.
преднамеренно—наўмы́сна.
преднамеренность—наўмы́снасць.
преднамеренный—наўмы́сны.
предначертание—прадначартáнне, прызначэ́нне.
предобеденный—прадабе́дзенны.
предок—про́дак.
предопределение—прызначэ́нне.
предопределить—прызнáчыць.
предоставить—прадаставіць.
предоставлять—прадастаўля́ць.
предостерегать—перасцерагáць, засцерагáць.
предостережение—перасцяро́га, засцяро́га.
предостеречь—перасцерагчы, засцерагчы.
предосторожность—перасцяро́га, засцяро́га.
предосудительность—адмо́ўнасць.
предосудительный—адмо́ўны.
предотвратить—адхіліць, папярэ́дзіць.

предотвращать—адхіля̀ць, папярэ̀джваць.
предохранѐние—засця̀рога.
предохранитель *тех.*—засцерага̀льнік.
предохранительный—засцерага̀льны.
предохранить—засцерагчы̀.
предохранять—засцерага̀ць.
предписание—прадпіса̀нне.
предписать—прадпіса̀ць.
предписывать—прадпі̀сваць.
предплечие—прадплѐчча.
предполагаемый—мяркуемы, дапушча̀льны.
предполагать—дапуска̀ць, меркава̀ць.
предположение—дапушчэ̀нне, меркава̀нне.
предположительный—дапушча̀льны.
предположить—дапусці̀ць.
предпослать—прадпасла̀ць.
предпоследний—прадапо̀шні, перадапо̀шні.
предпосылка—прадпасы̀лка.
предпочесть—аддава̀ць перава̀гу, палічы̀ць за лѐпшае.
предпочитать—аддава̀ць перава̀гу, лічы̀ць за лѐпшае.
предпочтение—перава̀га.
предприимчивость—прадпрыйма̀льнасць.
предприимчивый—прадпрыйма̀льны.
предприниматель—прадпрыѐмец, прадпрыѐмца.
предпринимательский—прадпрыйма̀льніцкі.
предпринимать—прадпрыйма̀ць, рабі̀ць за̀хады.
предпринять—прадпрыня̀ць, зрабі̀ць за̀хады.
предприятие—прадпрыѐмства.
предрасполагать—схіля̀ць.
предрасположение—схі̀льнасць.
предрасположить—схіліць.
предрассудок—забабо̀ны.
предрекать—прадрака̀ць.
предрешать—прадраша̀ць.
предрешить—прадраші̀ць.
председатель—старшыня̀.
председательский—старшы̀нскі.
председательство—старшы̀нства.
председательствовать—быць за старшыню̀, старшы̀нстваваць.
предсердие *анат.*—прадсэ̀рддзе.
предсказание—прадрака̀нне.
предсказатель—прадрака̀льнік.
предсказать—прадрачы̀.
предсказывать—прадрака̀ць.
предсмертный—прадсмяро̀тны.
представитель—прадстаўні̀к.
представительница—прадстаўні̀ца.
представительность—павà̀жнасць, самаві̀тасць, ві̀днасць.
представительный 1. (*о человеке*)—паважа̀ны, самавіты, ві̀дны; 2. (*об учреждении*)—прадстаўні̀чы.
представительство—прадстаўні̀цтва; полномочное представительство—по̀ўнамо̀цнае прадстаўні̀цтва.
представить 1. прадста̀ві̀ць; 2. *псіх.*—уявіць.
представление 1. прадстаўлѐнне; 2. *псіх.*—уяўлѐнне.
представлять 1. прадстаўля̀ць; 2 *псіх.*—уяўля̀ць.
представительный: представительная железа—прадстацельная залоза.
предстать—стаць (перад кім), з'яві̀цца.

предстоять—прадстаяць; мне предстоит случай—мне мае быць выпадак.
предстоящий—прадстаячы, які мае быць.
предтеча—папярэднік, прадцеча.
предубеждение—прадузяты погляд.
предубеждённый—прадузяты.
предуведомить—паведаміць загадзя.
предугадывать—прадугадваць, загадзя ўгадваць.
предумышленно—наўмысля, наўмысна.
предумышленный—наўмысны.
предупредительный 1. папераджальны; 2. (*любезный*)—вельмі ўважлівы.
предупредить—папярэдзіць.
предупреждать—папярэджваць.
предупреждение—папярэджанне.
предусматривать—прадугледжваць, прадбачыць.
предусмотренный—прадугледжаны, прадбачаны.
предусмотреть—прадугледзець, прадбачыць.
предусмотрительность—прадбачнасць.
предусмотрительный—прадбачлівы.
предчувствие—прадчуванне.
предчувствовать—прадчуваць.
предшественник—папярэднік.
предшественница—папярэдніца.
предшествовать—ісці ўперадзе.
предшествующий—папярэдні.
предъявитель—прад'яўнік.
предъявительница—прад'яўніца.
предъявить—прад'явіць.
предъявление—прад'яўленне.
предъявлять—прад'яўляць.
предыдущий—папярэдні.
преемник—пераемнік, наступнік.
преемственность—пераемнасць.
преемственный—пераемны.
прежде—перш, упярад, ранней; прежде всего—перш за ўсё, перш-на-перш.
прежде временно—дачасна.
прежде временность—дачаснасць.
прежде временный—дачасны.
прежний—ранейшы, мінулы.
презабавный—вельмі пацешны.
президент—прэзідэнт.
президентский—прэзідэнцкі.
президиум—прэзідыум.
презирать—пагарджаць (кім).
презрение—пагарда.
презренный—пагарджаны.
презрительность—пагарджанасць, пагарда.
презрительный—пагардны, пагардлівы.
преимущественно—пераважна.
преимущественный—пераважны.
преимущество—перавага.
преисподняя—пекла.
прейскурант—прэйскурант.
преклонение—пракланенне.
преклонный (*возраст*)—старыя гады.
преклоняться—праклоняцца.
прекословить—пярэчыць, супярэчыць.
прекрасно—прыгожа, харашо.
прекрасный—прыгожы.
прекратить—спыніць.
прекратиться—спыніцца.
прекращать—спыняць.
прекращаться—спыняцца.
прекращение—спыненне.

прелестный—прыго̀жы, чаро̀ўны.
прелесть—прыго̀жасць, харство̀, чаро̀ўнасць.
прелиминарный—прэлімінà рны.
преломление—праламлѐнне.
преломляемость—праламля̀емасць.
преломлять—праламля̀ць.
преломляться—праламля̀цца.
прелость—прэ̀ласць.
прелый—прэ̀лы.
прельстить—прыва̀біць.
прельщать—прыва̀бліваць.
прельщение—прыва̀ба.
прелюдия *муз.*—прэлю̀дыя.
премиальный—прэмі̀яльны.
преминуть: не преминуть—не прамінуць, не абмінуць.
премирование—прэміраванне.
премированный—прэміраваны.
премировать—прэміраваць.
премия—прэ̀мія.
премного *устар.*—вѐльмі мно̀га.
премудрость—вялікая му̀драсць.
премудрый—вѐльмі му̀дры.
премьер—прэм'ѐр.
премьера *театр.*—прэм'ѐра.
пренебрегать 1. (*брезгать*)—грэ̀баваць; 2. (*не уважать*)—зневажа̀ць.
пренебрежение—грэ̀баванне, зняважа̀ння.
пренебрежительно—грэ̀бліва, зняважа̀ліва.
пренебрежительный—грэ̀блівы, зняважлівы.
пренебречь—зняважыць.
прение (*гниение*)—прэ̀нне.
прения—спрэ̀чкі.
преобладание—перавà га.
преобладать—пераважа̀ць, мець перавà гу.
преобладающий—пераважны, пераважа̀ючы.
преображать—ператвара̀ць.
преображаться—ператвара̀ццà.
преобразить—ператварыць.
преобразиться—ператварыцца.
преобразование—пераўтварэ̀нне.
преобразователь—пераўтвара̀льнік, рэфарма̀тар.
преобразовательный—пераўтвара̀льны, рэфармава̀льны.
преобразовать—пѐраўтварыць, рэфармава̀ць.
преодолевать—перамага̀ць.
преодоление—перамо̀га.
преодолеть—перамагчы.
препарат—прэпара̀т.
препарировать—прэпарыраваць.
препинание: знаки препинания *грам.*—знакі прыпынку.
преподавание—выкладà нне.
преподаватель—выкла̀дчык.
преподавательница—выкла̀дчыца.
преподавательский—выкла̀дчыцкі.
преподавать—выкладà ць.
преподносить—падава̀ць.
препона—перашко̀да.
препоручать—прыпаруча̀ць, даруча̀ць.
препроводительный (*о бумаге*)—справаджа̀льны.
препроводить 1. (*кого*)—спра̀вадзіць; 2. (*бумагу*)—адасла̀ць.
препровождать 1. (*кого*)—праваджа̀ць, справаджа̀ць; 2. (*бумагу*)—адсыла̀ць.
препровождение (*времени*)—праваджэ̀нне, правядзѐнне.
препятствие—перашко̀да.

препятствовать—перашкаджа̀ць.
прервать—перарва̀ць, спыні̀ць.
перекание—спрэ́чкі.
пререкаться—спрача̀цца, пярэ́чыць.
прерогатива—прэрагаты́ва.
прерыватель *тех.*—перарыва̀льнік.
прерывать—перарыва̀ць, спыня̀ць.
прерывистый—перары́вісты, перары́ўны.
пресекать (*прекращать*)—спыня̀ць.
пресечь (*прекратить*)—спыні̀ць
преследование—праслѐдванне.
преследователь—праслѐдвацель.
преследовать—праслѐдваць.
пресловутый—праславу́ты.
пресмыкаться—прасмыка̀цца.
пресмыкающиеся 1. *зоол.*—паўзуны́; 2. (*о людях*)—нізкапакло̀ннікі.
пресноводный—преснаво̀дны.
пресный—прэ́сны.
прес—прэс.
пресса—прэ́са.
прессование—прасава̀нне.
прессованный—прасава̀ны.
прессовать—прасава̀ць.
прессовка—прасава̀нне.
пресс-папье—прэс-пап'ѐ.
престарелость—перастарэ́ласць, састарэ́ласць.
престарелый—перастарэ́лы, састарэ́лы.
престиж—прэсты́ж.
престол—прасто̀л.
преступление—злачы́нства.
преступник—злачы́нец, злачы́нца.
преступный—злачы́нны.
пресытиться—перанасы́ціцца, перасы́ціцца.
пресыщение—перасычэ́нне.
пресыщенность—перасы́чанасць.
пресыщенный—перасы́чаны.
претворить—ператвары́ць.
претворять—ператвара̀ць.
претендент—прэтэндэ́нт.
претендовать—прэтэндава̀ць.
претензия—прэтэ́нзія.
претенциозность—прэтэнцыёзнасць.
претенциозный—прэтэнцыёзны.
претерпевать—цярпе́ць, перано̀сіць.
претерпеть—перацярпе́ць, перанесці.
претить: мне это претит—мне гэта прыкра.
преткновение: камень преткновения—камень спатыкання.
преть—прэць.
преувеличение—пераўвелічэ́нне, перавелічэ́нне.
преувеличивать—пераўвялі́чваць, перавялі́чваць.
преувеличить—пераўвялі́чыць, перавялі́чыць.
преуменьшать—перамяншаць.
преуменьшение—перамяншэ́нне.
преуспевание—до̀бры по̀спех.
преуспевать—мець до̀бры по̀спех.
префект—прэфѐкт.
префикс *грам.*—прэ́фікс, прыста́ўка.
прецедент—прэцэдэ́нт.
при (*предл.*)—пры, за; при реке—пры рацэ; при свидетелях—пры сведках; это было еще при отце—гэта было яшчэ за бацькам.
прибавить—прыбавіць; дадаць.
прибавиться—прыбавіцца, дада̀цца.
прибавка—прыба́ўка, дадатак.
прибавление—прыбаўле́нне.

прибавлять—прыбаўля̀ць, дада̀ваць.
прибавляться—прыбаўля̀цца, дадава̀цца.
прибавочный—прыба̀вачны, дадатко̀вы; прибавочная стоимость—дадатковая варта̀сць.
прибаутка—прымаўка, прыгаво̀рка.
прибегать—прыбяга̀ць, звярта̀цца.
прибегнуть—прыбѐгнуць, звярну̀цца.
прибежать—прыбѐгчы.
прибежище—прыту̀лак, прыпы̀нак.
приберегать—прыберага̀ць.
приберечь—прыберагчы.
прибивать—прыбіва̀ць.
прибирать—прыбіра̀ць.
прибить—прыбіць.
приближаться—прыбліжа̀цца, набліжа̀цца, надыхо̀дзіць.
приближение—прыбліжэ̀нне, набліжэ̀нне, надыхо̀д.
приблизительно—прыбліз̀на.
приблизительность—прыбліз̀насць.
приблизительный—прыбліз̀ны.
приблизиться—прыбліз̀іцца, наблізіцца, надыйсці.
прибой—прыбо̀й.
прибор—прыбо̀р.
прибрать—прыбра̀ць.
прибрежный—прыбярэ̀жны, узбярэ̀жны.
прибывать—прыбыва̀ць.
прибыль—прыбы̀так.
прибыльность—прыбытко̀васць.
прибыльный—прыбытко̀вы.
прибытие—прыбы̀цце.
прибыть—прыбы̀ць.
привал—прыва̀л.
привалить 1. прыва̀ліць; 2. *(нахлынуть)*—нахлы̀нуць.
привар—прыва̀рак.
приварок—прыва̀рак.
приварочный—прыва̀рачны.
приватный—прыва̀тны.
приведение—прывядзѐнне.
привезти—прывезці.
привередливость—перабо̀рлівасць, капры̀знасць.
привередливый—перабо̀рлівы, капры̀зны.
привередник—перабо̀рлівы, капры̀знік.
привередничать—перабіра̀ць, капры̀зіць.
приверженец—прыхі̀льнік.
приверженность—прыхі̀льнасць.
привернуть *(винт)*—прывінці̀ць, прыкруці̀ць, прышрубава̀ць.
привёртывать *(винт)*—прывінчва̀ць, прыкру̀чваць, прышрубо̀ўваць.
привесить—прывесіць.
привесок—дава̀жка.
привести—прывесці.
привет—прывіта̀нне.
приветливость—прывѐтлівасць, вѐтлівасць.
приветливый—прывѐтлівы, вѐтлівы.
приветственный—прывіта̀льны.
приветствие—прывіта̀нне.
приветствовать—віта̀ць, прывіта̀ць.
привешивать—прывешваць.
прививать 1. прывіва̀ць; 2. *(оспу)*—прышчапля̀ць.
прививка—прышчэ̀пка.
прививочный—прышчэ̀пны.
привидение—здань.
привидеться—зда̀цца, прысні̀ца.
привилегированный—прывілеява̀ны.
привилегия—прывілѐя.
привинтить—прывінці̀ць, прыкруці̀ць, прышрубава̀ць.

привинчивать—прывінчваць, прыкрўчваць, прышрубоўваць.
привить—прышчапіць.
привкус—прысмак.
привлекательность—прывабнасць.
привлекательный—прывабны.
привлекать 1. прыцягваць; привлекать к ответственности—прыцягваць да адказнасці; 2. *перен.*—прывабліваць.
привлечение—прыцягненне, прыцягванне.
привлечь 1. прыцягнуць; 2. *перен.*—прывабіць.
привод 1. *тех.*—прывод; 2. (*в суд*)—прывод.
приводить—прыводзіць.
приводной *тех.*—прывадны; приводной ремень—прывадны рамень.
привоз—прывоз.
привозить—прывозіць.
привозный—прывазны, прывозны.
приволакивать—прывалакаць.
приволочь—прывалачы.
приволье—прывольле, раздольле.
привольный—прывольны, раздольны.
приворожить—прычараваць, прываражыць.
привратник—вартаўнік.
приврать—прыхлусіць.
привскочить—прыўскочыць, падскочыць.
привстать—прыўстаць.
привходящий—прыўходны, прыўходзячы.
привыкать—прывыкаць, прызвычайвацца.
привыкнуть—прывыкнуць, прызвычаіцца.
привычка—прывычка, звычка.
привычность—прывычнасць, прызвычаенасць.
привычный—прывычны, прызвычаены.
привязанность—прывязанасць, прыхільнасць.
привязанный 1. прывязаны; 2. *перен.*—прыхільны.
привязать—прывязаць.
привязчивость—прывязлівасць.
привязчивый—прывязлівы.
привязывать—прывязваць.
привязь—прывязь.
пригвождать—прыбіваць.
пригвоздить—прыгваздзіць, прыбіць.
пригибать—прыгінаць.
пригибаться—прыгінацца.
пригладить 1. прыгладзіць; 2. (*утюгом*)—прыпрасаваць.
пригласительный—запрашальны; пригласительный білет—запрашальны білет.
пригласить—запрасіць.
приглашать—запрашаць.
приглашение—запрашэнне.
приглушать—прыглушаць.
приглушить—прыглушыць.
приглядеться—прыглядзецца, прыглядзецца.
приглянуться—спадабацца.
пригнать 1. прыгнаць; 2. (*пригладить*)—прыгнаць, дапасаваць.
пригнетать—прыгнятаць.
пригнуть—прыгнуць.
пригнуться—прыгнуцца.
приговаривать—прыгаварваць.
приговор—прыгавор, прысуд.
приговорить—прыгаварыць, прысудзіць.
пригодиться—спатрэбіцца.
пригодность—прыгоднасць.
пригодный—прыгодны, прыдатны.
пригожий—прыгожы.

приголубить—прыгалу̀біць.
пригонять 1. прыганя̀ць; 2. (*прилаживать*)—дапасо̀ўваць.
пригорать—прыгара̀ць.
пригорелый—прыгарэ̀лы.
пригореть—прыгарэ̀ць.
пригород—пры̀гарад.
пригородный—пры̀гарадны.
пригорок—прыго̀рак.
пригоршни—пры̀гаршчы.
пригорюниться—зажуры̀цца, засмуткава̀ць, замарко̀ціцца.
приготовительный—падрыхто̀ўчы.
приготовить—падрыхтава̀ць.
приготовиться—падрыхтава̀цца.
приготовление—падрыхтава̀нне, падрыхто̀ўванне.
приготовлять—падрыхто̀ўваць, рыхтава̀ць.
приготовляться—рыхтава̀цца, падрыхто̀ўвацца.
приграничный—прыгані̀чны, прымѐжны.
пригревание—прыграва̀нне.
пригревать—прыграва̀ць.
пригрезиться—прывярэ̀зіцца, прымро̀іцца.
пригреть—прыгрэ̀ць.
пригрозить—прыгразѝць, прыстра̀шыць.
пригульный: пригульный скот—прыблудная жывёла.
придавить—прыдушѝць, прыці̀снуць, прыда̀ві̀ць.
придаток—прыда̀так, дада̀так.
придаточный: придаточное предложение *грам.*—даданы сказ.
придать 1. дада̀ць; 2. (*значение*)—нада̀ць.
придача—прыда̀ча, дада̀ча.
придвигать—прысо̀ўваць, прыстаўля̀ць.
придвигаться—прысо̀ўвацца.
придвинуть—прысу̀нуць, прыста̀ві̀ць.
придвинуться—прысу̀нуцца.
придворный—прыдво̀рны.
приделать—прыла̀дзіць, прымайстрава̀ць.
приделывать—прыла̀джваць, прымайстро̀ўваць.
придержать—прытрыма̀ць.
придерживать—прытры̀мліваць.
придерживаться—прытры̀млівацца.
придираться—прыдзіра̀цца.
придирка—прыдзі́рка, прычэ́пка.
придирчивость—прыдзі́рлівасць, прычэ́пнасць.
придирчивый—прыдзі́рлівы.
придорожный—прыдаро̀жны.
придраться—прычапі̀цца, прывяза̀цца.
придумать—прыду́маць.
придумывать—прыду́мваць.
придурковатость—прыдуркава̀тасць.
придурковатый—прыдуркава̀ты.
придурь—прыду́р.
придушить—прыдуш̀ыць.
придыхание *грам.*—прыдыха̀нне.
приедаться—прыяда̀цца.
приезд—прыѐзд.
приезжать—прыязджа̀ць.
приезжий—прыѐзджы.
приём—прыём.
приёмка—прыёмка.
приемлемость—прыѐмлемасць, прыйма̀льнасць.
приемлемый—прыѐмлемы, прыйма̀льны.
приёмная—прыёмная.
приёмник *тех.*—прыёмнік.
приёмный—прыёмны.
приёмочный—прыёмачны.
приёмщик—прыёмшчык.
приёмщица—прыёмшчыца.

приесться—прыѐсціся, апры-краць.
приехать—прыѐхаць.
прижать 1. прыціснуць; 2. (*к груди*)—прытуліць, прыгарнуць.
прижаться 1. прыціснуцца; 2. (*к груди*)—прытуліцца, прыгарнуцца.
прижечь—прыпаліць, прыпячы.
прижигать—прыпа́льваць, прыпяка́ць.
прижизненный—прыжыццёвы.
прижим—прыціск.
прижимать 1. прыціска́ць; 2. (*к груди*)—прытульваць, гарнуць.
прижимистый 1. прыціскліві; 2. *перен.*—скупы, скна́ра.
приз—прыз.
призадуматься—прызадумацца.
призвание—прызва́нне.
призвать 1. заклі́каць, паклі́каць; 2. *воен.*—прызва́ць.
приземистый—прызе́місты, прыса́дзісты, каржакава́ты.
призма—прызма.
призматический—прызматычны.
признавать—прызнава́ць.
признаваться—прызнава́цца.
признак—адзна́ка, прыме́та.
признание—прызна́нне.
признанный—прызна́ны.
признательно—удзя́чна.
признательность—удзя́чнасць.
признательный—удзя́чны.
признать—прызна́ць.
признаться—прызна́цца.
призовой—прызавы.
призор (*присмотр*)—дагля́д, до́гляд.
призрак—здань.
призрачность—зданнёвасць.
призрачный—зданнёвы.
призыв 1. за́клік; 2. *воен.*—прызыў.
призывать 1. заклі́каць; 2. *воен.*—прызыва́ць.
призывник—прызыўні́к.
призывной 1. заклі́каючы; 2. *воен.*—прызыўны.
прииск—прыіск, капа́льня.
приискание—падшука́нне.
приискать—падшука́ць, знайсці.
приказ—зага́д.
приказание—зага́д.
приказать—загада́ць.
приказный *истор.*—прыка́зны.
приказчик—прыка́зчык.
приказчица—прыка́зчыца.
приказывать—зага́дваць.
прикалывать—прыко́лваць.
прикарманивать *разг.*—прысво́йваць, прыбіра́ць да кішэні.
прикасаться—датыка́цца, дакрана́цца.
прикатить—прыкаці́ць.
прикинуть—прыкі́нуць.
прикинуться—прыкі́нуцца.
приклад 1. (*ружья*)—прыкла́д; 2. (*для платья*)—дакла́д.
прикладной—прыкладны.
прикладывать—прыкла́дваць, дадава́ць.
приклеивать—прыкле́йваць.
приклеить—прыкле́іць.
приклейка—прыкле́йка.
приклепать—прыкляпа́ць.
приклёпывать—прыклёпваць.
приключаться—здара́цца.
приключение—прыго́да, здарэ́нне.
приключенческий—авантю́рніцкі.
приключиться—здарыцца.
приковать—прыкава́ць.
приковывать—прыко́ўваць.
приколачивать—прыбіва́ць.
приколотить—прыбіць.
приколоть—прыкало́ць.

прикомандирование—прыкамандзіраванне.
прикомандировать—прыкамандзіраваць.
прикорм—прыкорм.
прикосновение—дакрананне.
прикоснуться—даткнуцца, дакрануцца.
прикрасить—прыхарашыць, аздобіць.
прикрашивать—прыхарошваць, аздабляць.
прикрепить—прымацаваць.
прикрепление—прымацоўванне, прымацаванне.
прикреплять—прымацоўваць.
прикрывать 1. прыкрываць; 2. (*притворять*)—прычыняць.
прикрытие—прыкрыцце, заслона.
прикрыть 1. прыкрыць; 2. *(притворить)*—прычыніць.
прикупать—прыкупляць, дакупляць.
прикупить—прыкупіць, дакупіць.
прикурить—прыкурыць.
прикурнуть—прыкархнуць.
прикусить—прыкусіць.
прикуска—прыкуска.
прилавок—прылавак.
прилагательное *грам.*—прыметнік.
прилагать—прыкладаць.
приладить—прыладзіць, прымайстраваць.
прилаживать—прыладжваць, прымайстроўваць.
приласкать—прыласкаць, прылашчыць, прыгалубіць.
приласкаться—прыласкацца, прылашчыцца, прыгалубіцца.
прилегать—межаваць, межавацца.
прилегающий—прылеглы, сумежны.
прилежание—старанасць, працавітасць.
прилежный—старанны, працавіты.
прилепить—прыляпіць.
прилеплять—прыляпляць, прылепліваць.
прилёт—прылёт.
прилетать—прылятаць.
прилететь—прыляцець.
прилечь—прылегчы.
прилив—прылыў.
приливать—прыліваць.
прилизать—прылізаць.
прилизаться—прылізацца.
прилипать—прыліпаць.
прилипнуть—прыліпнуць.
прилипчивый—прыліпчывы.
приличествовать: ему это не приличествует—яму гэта не пасуе, яму гэта не да твару.
приличие—прыстойнасць.
приличный—прыстойны.
приложение 1. дадатак; 2. *грам.*—прыдатак.
приложить—прыкласці, дадаць.
прильнуть—прыгарнуцца, прытуліцца, прыхінуцца.
примазать—прымазаць.
примазаться—прымазацца.
приманить—прывабіць, прынадзіць.
приманка—прываба, прынада.
примачивать—прымочваць.
применение—прыстасаванне.
применимость—прыстасоўнасць.
применимый—прыстасоўны.
применительно—прыстасоўна.
применить—прыстасаваць, ужыць.
примениться—прыстасавацца.
применять—прыстасоўваць, ужываць.

применяться—прыстасо̀ўвацца.
пример—пры̀клад.
примерзать—прымярза̀ць.
примёрзнуть—прымёрзнуць.
примерить—прымяра̀ць, прымя̀рыць.
примерка—прымя̀рка.
примерно 1. (*приблизительно*)—пры̀кладна, прыблі̀зна; 2. (*образцово*)—узо̀рна.
примерный 1. пры̀кладны, прыблі̀зны; 2. узо̀рны.
примесь—прымесь.
примета—прымѐта, адзна̀ка.
приметать 1. прыфастрыгава̀ць; 2. (*петли*)—абкі̀даць.
приметить—прымѐціць, заўва̀жыць.
приметливость—прымѐтлівасць.
приметливый—прымѐтлівы, заўва̀жлівы.
примечание—ува̀га.
примечательность—выда̀тнасць, зна̀чнасць, рэ̀дкасць.
примечательный—зна̀чны, выда̀тны, ва̀рты ўва̀гі.
примечать—прымяча̀ць, заўважа̀ць.
примешать—прымяша̀ць.
примешивать—прымѐшваць.
примиренец—прымірэ̀нец.
примирение—прымірэ̀нне.
примиренческий—прымірэ̀нчы.
примиренчество—прымірэ̀нцтва.
примиритель—прымірыцель.
примирительный—прымірыцельны.
примириться—прымірыцца.
примиряться—мірыцца.
примитив—прымітыў.
примитивность—прымітыўнасць.
примитивный—прымітыўны.
примкнуть—прымкну̀ць, далучы̀цца.
примолкнуть—прымо̀ўкнуць, прыці̀хнуць, заці̀хнуць.
приморский—прымо̀рскі.
приморье—прымо̀р'е.
примоститься—прымасці̀цца, прыла̀дзіцца.
примочка *мед.*—прымо̀чка.
примула *бот.*—прымула.
примус—прымус.
примчаться—прымча̀цца.
примыкание—далучэ̀нне.
примыкать—далуча̀цца.
примять—прымя̀ць.
принадлежать—налѐжаць.
принадлежности—прыла̀ды.
принадлежность—прыналѐжнасць, налѐжнасць.
приналечь—прыналѐгчы, падналѐгчы.
принарядиться—прыбра̀цца, убра̀цца.
принести—прынѐсці.
приниженность—прыні̀жанасць.
приниженный—прыні̀жаны.
принизить—прыні̀зіць.
приникать—прыту̀львацца, туліцца, хіну̀цца.
приникнуть—прытулі̀цца, прыхіну̀цца, прыгарну̀цца.
принимать—прымаць, браць; принимать во внимание—браць, прымаць пад увагу; принимать к сведению—прымаць да ведама.
приниматься (*за дело, работу*)—бра̀цца, распачына̀ць.
приноравливаться—прыстасо̀ўвацца, прыла̀джвацца, дапасо̀ўвацца.
приноровиться—прыстасава̀цца, прыла̀дзіцца, дапасава̀цца.
приносить—прыно̀сіць.

приношение—прынашэ̀нне.
принудительный—прымусо̀вы.
принудить—прымýсіць.
принуждать—прымуша̀ць.
принуждение—прымýс.
принуждённость—прымýшанасць, прымусо̀васць.
принуждённый—прымýшаны.
принц—прынц.
принцесса—прынцэ̀са.
принцип—прынцып.
принципиально—прынцыпо̀ва.
принципиальность—прынцыпо̀васць.
принципиальный—прынцыпо̀вы.
принятие—прыня̀ццe.
принятый—прыня̀ты.
принять—прыня̀ць; принять во внимание—прыняць пад увагу; принять к сведению—прыняць да ведама.
приняться (*за дело, работу*)—узя̀цца, распача̀ць.
приободрить—падбадзёрыць.
приободриться—падбадзёрыцца.
приобрести—набы̀ць.
приобретатель—набыва̀льнік.
приобретать—набыва̀ць.
приобретение—набыва̀нне, набыццё.
приобщаться—прылуча̀цца, далуча̀цца.
приодеться—прыбра̀цца, убра̀цца.
приоритет—прыарытэ̀т.
приосаниться—прыаса̀ніцца.
приостанавливать—прыпыня̀ць.
приостанавливаться—прыпыня̀цца.
приостановить—прыпыні̀ць.
приостановиться—прыпыні̀цца.
приостановка—прыпы̀нак.
приотворить—тро̀хі адчыні̀ць.
приотворять—тро̀хі адчыня̀ць.
приоткрыть—тро̀хі адчыні̀ць.
приохотить—прыахво̀ціць, захво̀ціць.
припадать—прыпада̀ць.
припадок—прыпа̀дак.
припадочный—прыпа̀дачны.
припаивать—прыпа̀йваць.
припайка—прыпа̀йка.
припарка—прыпа̀рка.
припасать—запаса̀ць, назапа̀шваць.
припасти—назапа̀сіць.
припасы—прыпа̀сы.
припаять—прыпаяць.
припев—прыпѐў.
припёк (*хлеба*)—прыпёк.
припекать—прыпяка̀ць.
припереть—прыпѐрці.
припечатать 1. *тип.*—дадрукава̀ць; 2. (*приложить печать*)—прыпячата̀ць.
припечь—прыпячы̀.
припирать—прыпіра̀ць.
приписать—прыпіса̀ць.
приписка—прыпі̀ска.
приписной—прыпі̀сны.
приписывать—прыпі̀сваць.
приплата—прыпла̀та, даплата.
приплатить—прыплаці̀ць, даплаці̀ць.
приплачивать—прыпла̀чваць, даплачваць.
приплести—прыплѐсці.
приплестись—прыплѐсціся, прыцягну̀цца, прывалачы̀ся.
приплод—прыпло̀д.
приплывать—прыплыва̀ць.
приплыть—прыплы̀сці, прыплы̀ць.
приплюснуть—прыплю̀снуць.
приплясывать—прытанцо̀ўваць.
приподнимать—прыпадні̀ма̀ць.
приподнять—прыпадня̀ць

припоминание—прыпамінàнне.
припоминать—прыпамінàць.
припомнить—прыпóмніць.
приправа *(к кушанью)*—прыпрàва,
приправить—прыпрàвіць.
приправлять—прыпраўля̀ць.
припрыгивать—прыскóкваць.
припрыгнуть—прыскóкнуць.
припрыжка: вприпрыжку—у падскок.
припрягать—прыпрагàць.
припряжка—прыпрàжка.
припряжной—прыпрэ̀жаны.
припрятать—захавàць.
припрятывать—захóўваць.
припугнуть—прыстрàшыць, прыпужàць.
припустить—прыпусці̀ць.
припутать—прыблы̀таць.
припухать—прыпухàць, напухàць.
припухлость—прыпýхласць, пухлі̀на.
припухлый—напýхлы.
припухнуть—прыпýхнуць, напýхнуць.
прирабатывать—прырабля̀ць.
приработать—прырабі̀ць.
приработок—прырабóтак.
приравнивать—прыраўнóўваць.
приравнять—прыраўня̀ць.
прирастать—прырастàць.
прирасти—прырасці̀.
приращение—прырашчэ̀нне.
приревновать—прыраунавàць, пазайздрóсці̀ць.
прирезать—прырэ̀заць.
приречный—прырэ̀чны, надрэ̀чны.
природа—прырóда.
природный—прырóдны.
природоведение—прыродазнàўства.
прирождённый—прырóджаны.
прирост—прырóст.
приросток—прырóстак.
приросший—прырóсшы.
прирубежный—прырубэ̀жны, прымэ̀жны.
приручать—прыручàць.
приручение—прыручэ̀нне.
приручить—прыручы̀ць.
присаживаться—прысàджвацца, падсàджвацца.
присасываться—прысàсвацца, прысмóктвацца.
присвист—пры̀свіст.
присвистывать—прысві̀стваць.
присвоение—прысваэ̀нне.
присвоить—прысвóіць.
приседание—прысядàнне.
приседать—прысядàць.
присест: в один присест—у адзін прысест.
присесть—прысэ̀сці.
присказка—пры̀казка, пры̀маўка.
прискакать—прыскакàць.
прискорбие: к прискóрбию—нажаль.
прискорбный—засмýчаны, журбóтны, сýмны; прискорбный случай—прыкры выпадак.
прискучить—надакýчыць, абры̀дзець.
прислать—прыслàць.
присловье—пры̀казка, пры̀маўка.
прислонить—прыстàвіць, прыхілі̀ць, прытулі̀ць.
прислониться—прыхілі̀цца, прытулі̀цца.
прислоняться—прыхіля̀цца, прытýльвацца.
прислуга 1. служàнка; 2. (*орудийная*) *воен.*—гарматная прыслýга.
прислуживать—прыслугóўваць, прыслýжваць.

прислужник—прыслу́жнік, паслугач.
прислушаться—прыслу́хацца.
присматривать—даглядаць, наглядаць.
присматриваться—прыглядацца.
присмотр—до́гляд, нагля́д.
присмотреться—прыглядзе́ц-ца, прыгле́дзецца.
присниться—прысні́цца.
присовокуплять—дадава́ць, далуча́ць.
присоединение—далучэ́нне, прылучэ́нне.
присоединительный—далуча́льны, прылуча́льны.
присоединить—далучы́ць, прылучы́ць.
присоединиться—далучы́цца, прылучы́цца.
присоединять—далуча́ць, прылуча́ць.
присоединяться—далуча́цца, прылуча́цца.
присолить—прысалі́ць.
присоса́ться—прысаса́цца, прысмакта́цца.
присоседиться—прысусе́дзіцца, прысябрава́цца.
присоска—прысмо́ктванне, прысыса́нне.
присохнуть—прысо́хнуць.
приспеть—паспе́ць, прыспе́ць, наспе́ць.
приспешник—прыспе́шнік.
приспешница—прыспе́шні-ца.
приспичить *разг.*—прыспі́чыць.
приспособить—прыстасава́ць, дапасава́ць.
приспособиться—прыстасава́цца, дапасава́цца.
приспособленец—прыспасабле́нец.
приспособление 1. прыстаса-ва́нне, дапасава́нне; 2. *(о механизме)*—прыла́да.
приспособленность—прыстаса-ва́насць.
приспособленный—прыстаса-ва́ны, дапасава́ны.
приспособленчество—прыс-пасабле́нцтва.
приспособляемость—прыстаса-ва́льнасць, дапасава́льнасць.
приспособлять—прыстасо́ў-ваць, дапасо́ўваць.
приспособляться—прыстасо́ў-вацца, дапасо́ўвацца.
приставание—прыстава́нне.
приставать 1. *(надоедать)*—прыстава́ць, чапі́цца, прычапля́цца; 2. *(причаливать)*—прыстава́ць.
приставить—прыста́ві́ць.
приставка *грам.*—прыста́ўка, прэ́фікс.
приставлять—прыстаўля́ць.
приставной—прыстаўны.
пристально—пі́льна.
пристальный—пі́льны.
пристанище—прыста́ні́шча, прыту́лак.
пристань—прыстань.
пристать 1.*(прилипнуть)*—прыста́ць; 2. *(надоесть)*—прыста́ць, прычапі́цца; 3. *(причалить)*—прыста́ць; 4. *(примкнуть)*—прымкну́ць. Это ему не пристало—гэта яму не прыстала.
пристёгивать 1.прышпі́льваць; 2. *(о шитье)*—прыфастрыго́ўваць.
пристегнуть 1. прышпі́лі́ць; 2. *(о шитье)*—прыфастрыгава́ць.

пристойность—прыстóйнасць.
пристойный—прыстóйны.
пристраивать 1. *(о здании)*—прыбудóўваць; 2. *(давать место, должность)*—прыстрóйваць.
пристраиваться—прыбудóўвацца, прыстрóйвацца.
пристрастие—старóннасць, прыстрàсце.
пристраститься—прыстрасцíцца.
